# «SOS» з Падгорнай

## Карэспандэнт «Звязды» даследавала праблемы прыватнага сектара ў цэнтры Магілёва

**Знаходзіцца ён не ў самым прыстасаваным для бесклапотнага жыцця месцы — каля падножжа гары, з якой пасля кожнага моцнага дажджу спадаюць тоны вады. Калі б не калектары, якія стрымліваюць яе моц, жыць тут было б немагчыма.**
**Але тэрмін эксплуатацыі гэтых інжынерных камунікацый налічвае ўжо не адзін дзясятак гадоў.**
**З боку мікрараёна Юбілейны пачалі разбурацца два калектары, і з кожным наступным дажджом сітуацыя абвастраецца.**
**Жыхары прыслалі ў рэдакцыю па электроннай пошце здымкі з месца, як пацверджанне сваіх слоў. «Цэлы год нам абяцаюць адрамантаваць калектары, але ніякіх зрухаў, — абураюцца людзі. — Пасля звароту да намесніка старшыні гарвыканкама 13 ліпеня нічога дагэтуль не змянілася.**
**Між тым пачала абвальваецца дарога.**
**Ніхто мер па ліквідацыі наступстваў не прымае...»**

### ПАСЛЯ ДАЖДЖУ СЦЕЖКА ЗМЕНШЫЛАСЯ НА 1,5 МЕТРА

Тэрмінова саджуся ў гарадскі аўтобус №39 (адзіны маршрут на ўсю Падгорную і Паднікolле) і еду, каб асабіста ўпэўніцца, што жыхары не перабольшваюць сваю бяду.

Мяне сустракае вядомы ўсім магілёўскім чыноўнікам сваёй прынцыповасцю і гаспадарчасцю **староста мікразоны Падгорная Аляксандр ПІКУЛЯ.** Разам рушым на месца. Па дарозе Аляксандр тлумачыць, што сваё бяздзеянне гарадскія ўлады апраўдваюць адсутнасцю грошай. Але ж калі не вырашыць праблему сёння, заўтра яна можа стаць катастрофай, упэўнены староста.

Карціна і насамрэч не радасная. Уздоўж абвалу нацягнута загараджальная стужка, але яна разам з зямлёй ужо з'ехала ўніз. Людзі ідуць па экстрэмальнай сцежцы адзін за адным.

— Вы часта карыстаецеся гэтай дарогай? — пытаемся ў мінакоў.

— Штодня. Наверсе прыпынак грамадскага транспарту, а гэта сцяжынка вядзе на Тэхнапрыбор.

— Не страшна, што аднойчы зямля ўцячэ з-пад ног?

— Спадзяёмся, што такога не адбудзецца. Больш страшна за дзяцей, яны ж тут і на веласіпедах лётаюць.

Калектар пракладзены з мікрараёна Юбілейны праз Падгорную на водаачышчальныя збудаванні. Камунікацыям, кажа староста, 45 гадоў, трэба рабіць капітальны рамонт.

— 13 ліпеня адвалілася адна частка трубы, а 1 жніўня паляцелі яшчэ дзве, следам за імі ўніз паехала і сцяжынка, — хвалюецца Аляксандр Васілевіч. — Спаўзло прыкладна 1,5-2 метры зямлі, вадой затапіла 6-ты і 7-мы завулкі Падгорнай, размыла агароды. І ўсё гэта адбываецца паблізу ад чыгункі.

Быццам у пацвярджэнне гэтых слоў зверху грукоча лакаматыў. Староста паказвае яшчэ адзін напаўразбураны калектар. «Праз нашу Падгорную наогул праходзіць шмат калектараў: водалiўневы, водаправодны, каналізацыйны, газавы», — паведамляе ён па дарозе. А зламаныя жалезабетонныя пліты, што тырчаць з гары, збоку рэшткі трубы — гэта, як высветлілася, і ёсць калектар.


Небяспечны мосцік насупраць дзіцячага садка.

Тамара Мікалаеўна жыве якраз непадалёку. Сцяжынку, па якой людзі ходзяць з аўтобуснага прыпынку ў мікрараён Тэхнапрыбор, называе паласой перашкод. «Жалезную лесвіцу для спуску ад прыпынку зрабілі, а вось для пад'ёму ў раёне Тэхнапрыбора — не. Людзі караскаюцца, як малпы. А яшчэ гэта экстрэмальная сцежка, якая ўсё больш разбураецца! Дастаткова чарговага моцнага ліўню, каб з-пад зямлі на паверхню вынесла астатнія бетонныя кольцы», — перажывае яна.

На ўзгорку знаходзіцца школа №33. Яе відаць ад дома Тамары Мікалаеўны. Тэарэтычна дзеці не павінны тут з'яўляцца, але падлеткі заўсёды шукаюць прыгод. Яны не ўяўляюць, наколькі небяспечнымі могуць быць гульні ў гэтай зоне.

— Сёння тэлефанаваў адзін з дэпутатаў гарсавета, цікавіўся сітуацыяй на Падгорнай, — уздыхае Пікуля. — Я яму расказаў пра калектар, пра раку Дзебру. Але тут не цікавіцца трэба, а дзейнічаць. Кіраўніцтва ўпраўлення камунальнага будаўніцтва і дарожнікі яшчэ летась абяцалі навесці парадак да 1 лістапада. Ёсць адказы, якія пацвярджаюць гэта. Не зрабілі. А сёлета адбыўся чарговы абвал.

### ДЗЕБРА СТАМІЛАСЯ ЧАКАЦЬ

Яшчэ адна праблема — стан аўтамабільнага моста цераз раку Дзебру. Мастоў на вуліцы Катоўскага два. Першы, каля крамы №127, галоўны — звязвае горад з мікрараёнам. Калі прыгледзецца, то і на ім відны «шрамы» — сляды ліквідацыі наступстваў апошніх ліўняў. Бяскрыўдная на першы погляд рачулка падчас непагадзі ператвараецца ў неўтаймаваны паток, узровень у ёй падымаецца на 2-2,5 метра. Якраз на вышыню тых жалезабетонных пліт, якія пакладзены ўздоўж яе берагоў.

Але цяпер людзей больш хвалюе стан другога моста, які знаходзіцца ў канцы вуліцы Катоўскага. Яго выгляд, насамрэч, жахлівы. Здаецца, што ён жыве ўласным жыццём. Бетон безнадзейна чапляецца за пясок, які ўпарта размывае рака.


Да чыгункі ад месца аварыі рукой падаць.

Аднойчы на гэтым месцы ледзь няшчасце не адбылося. Пліты, якія дасталі са дна ракі, пакінулі абы-як, некаторыя з іх утваралі нешта накшталт буданоў. Летась каля гадзіны ночы старосту патэлефанаваў жыхар дома, які знаходзіцца насупраць злашчаснага моста: падлеткі наладзілі гульні акурат каля тых пліт. Староста ледзь дачакаўся раніцы і ў 6 гадзін ужо тэлефанаваў адказным асобам. У той жа дзень з дапамогай кранаў пліты склалі ў стос крыху далей ад берага, так яны і ляжаць дагэтуль.

На апошні зварот у Магілёўскі гарвыканкам Аляксандр Пікуля атрымаў адказ, што пліты будуць складзіраваны ў іншым месцы, а берагі Дзебры чакае чарговая порцыя пяску. Наколькі хопіць такога ўмацавання? Больш сур'ёзныя работы адкладаюцца на наступны год. Калі аб'ект уключаць у інвестыцыйную праграму.

Дзебра за апошнія пяць гадоў шмат нерваў папсавала не толькі мясцовым жыхарам, але і мясцовай уладзе. Каб утаймаваць яе, з бюджэту за 2010—2014 гады было выдзелена амаль 7 мільярдаў недэнамінаваных рублёў. Работы вяліся ў тры чаргі. З верасня 2010 года па люты 2011-га на адлегласці 350 метраў ад Дняпра і да гэтага моста пойма была ўмацавана пластмасавымі сотамі-рашоткамі, якія засыпалі шчэбнем. Але пасля першай жа паводкі ў маі 2011 года, кажа староста, нічога ад гэтага шчэбню не засталося — усё змыла ў Днепр.

У 2013 годзе была спроба ўмацаваць бераг з дапамогай жалезабетонных пліт, але зрабілі гэта таксама няўдала, і пліты пасля чарговага ліўню абрынуліся. Пасля ўмацоўвалі бераг з дапамогай грунту: кажуць, прывезлі больш за 800 машын. Але яго часткова таксама змыла ў Днепр.

### САПСАВАНАЯ ДАРОГА, НЕПАДКЛЮЧАНЫЯ ЛІХТАРЫ І НЕБЯСПЕЧНЫ МОСЦІК

Мясцовыя жыхары лічаць, што іх вуліца — наглядны прыклад звычайнай безгаспадарчасці. Аляксандр Харкевіч, які жыве на вуліцы Катоўскага 55 гадоў, кажа: гэта адбываецца таму, што пажаданні жыхароў спачатку ігнаруюцца, а потым позна нешта мяняюць. Навошта, напрыклад, трэба было зразаць вербы, якія раней умацоўвалі сваімі каранямі берагі Дзебры? Тое, што раней рабілі дрэвы, цяпер спрабуюць вырашыць з дапамогай пяску. Выкарыстоўваючы немалыя грошы без эфекту.


Летась абы-як кінутыя пліты ледзь не прывялі да трагедыі.

Наконт размяшчэння аўтамабільнага моста таксама былі спрэчкі. Архітэктарам чамусьці захацелася вынесці яго ў канец вуліцы, хоць жыхары прасілі зрабіць пасярэдзіне. Тут шчыльнейшая жылая забудова, і, калі здарыцца нейкае няшчасце, аператыўным службам было б лягчэй дабрацца. Мосцік зрабілі, але пешаходны. Ён цяпер злучае вуліцу Ламаносава і завулак Слабодскі.

Сэрца баліць за яшчэ адзін пешаходны мосцік — драўляны і без парэнчаў. Знаходзіцца якраз насупраць дзіцячага садка №39. У спакойным стане Дзебра неглыбокая, але ці многа трэба вады для бяды?

— Колькі разоў мы казалі кіраўніцтву дарожна-маставога прадпрыемства, што крыху вышэй па цячэнні ёсць добры металічны мосцік з парэнчамі, якім ніхто не карыстаецца. Чаму б яго сюды не перанесці? Але нас ніхто слухаць не жадае, — скардзіцца Аляксандр Пікуля.

Дарога — асобная размова. У 2011 годзе па праекце яе павінны былі заасфальтаваць. Спачатку работы вяліся вельмі актыўна, аднаго толькі грунту было вывезена каля 50 машын. Потым столькі ж прывезлі шчэбню. Але на гэтым усё і прыпынілася. Як патлумачылі людзям: скончыліся сродкі. Толькі пасля шматлікіх зваротаў у розныя інстанцыі жыхароў вуліцы і асабіста Аляксандра Пікулі, прывезлі асфальтавую крошку і ледзь укаталі тую вуліцу. Пра асфальт цяпер ніхто і не ўспамінае.

Яшчэ адзін прыклад безгаспадарчасці — ліхтары. Іх як паставілі 5 гадоў таму, так яны і стаяць без справы. Уяўляеце? Ніводнага дня нават не працавалі. Сама не лічыла, колькі там гэтых бескарысных слупоў, але староста ўдакладніў — 22. Як кажуць, без каментарыяў.


Хутка сцяжынка абрынецца ўслед за калектарам.

**Галоўны інжынер упраўлення капітальнага будаўніцтва Магілёўскага гарвыканкама Віталь ШУМЕЙКА** добра ведае праблему:

— Правы бераг Дзебры і добраўпарадкаванне прылеглай тэрыторыі — гэта самы клопатны для нас аб'ект, — кажа ён. — Мы яго заказчыкі, і ўсе пытанні па ім знаходзяцца ў нас на кантролі. На жаль, у сувязі з адсутнасцю фінансавання нічога маштабнага зрабіць пакуль не можам. Ідзе пастаянны падмыў адхонаў ракі. Ранейшы праект па ўмацаванні берагоў сябе не апраўдаў, падвяла яго якасць. Жалезабетонныя пліты падчас першай жа паводкі знесла, і яны цяпер ляжаць на беразе. Мы неаднаразова прымалі меры, каб захаваць мост у нармальным стане. Бетануем асобныя яго ўчасткі, адхоны. Знізу паклалі пліту, каб вада трапляла не на зямлю, а на яе і гасілася гэтая турбулентнасць. Але далей адхоны размываюцца. Летась вельмі шмат завезлі грунту, каб іх хоць неяк умацаваць.

На сённяшні дзень існуе новае праектнае рашэнне, якое дакладна будзе працаваць. Але для таго, каб добра замацаваць рэчышча, трэба каля 2 мільярдаў у старых грошах. З году ў год мы звяртаемся з просьбай аб выдзяленні сродкаў, але безвынікова. А без грошай там нічога не зробіш. Для поўнага завяршэння работ па рацэ наогул патрэбна 4,5 мільярда. Па-першае, вельмі вялікая працяглаць участка будаўнічых работ, па-другое, каб утаймаваць Дзебру, трэба заманаліціць бераг, пакласці сетку, біятэкстыль, а потым пліты і зноў усё гэта заманаліціць. І гэта датычыцца, паўтаруся, толькі правага боку ракі. А калі браць цалкам увесь наш аб'ект з дарогай, ліхтарамі і добраўпарадкаваннем правага боку ад ракі Дзебра, спатрэбіцца наогул 11 мільярдаў рублёў. На асфальт грошай няма, і мы, каб людзі не пакутавалі, часова паклалі асфальтавую крошку. У нашых сілах толькі падтрымліваць усё ў больш-менш прыстойным выглядзе. І робім гэта выключна за нашы сродкі. Але ж мы самі бюджэтная арганізацыя.

Што датычыцца водаліўневых калектараў, то наглядам за імі займаецца магілёўскае Дарожна-маставое прадпрыемства.

— Работы па рамонце гэтых труб будуць выкананы ў першай палове жніўня, — запэўніў **галоўны інжынер службы Дзмітрый БІРУКОЎ.** — Плануецца зрабіць устройства водаадводных латакоў з умацаваннем адхонаў і адсыпкай дарожкі.

#### Каментарый у тэму

**Намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Сяргей ДЗЯДОВІЧ:**

— Сітуацыю па Дзебры горад добра ведае, як і тое, што гэты аб'ект трэба завяршыць. Мы планавалі заняцца ім сёлета, але не хапіла грошай у бюджэце. Таму будзем глядзець, каб пры фарміраванні бюджэту на наступны год аб'ект быў уключаны ў інвестыцыйную праграму. Калектарам таксама будзем займацца — рабіць падтрымліваючы рамонт або мяняць нейкія ўчасткі. Але зноў-такі ўсё гэта пры наяўнасці бюджэтнага фінансавання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара і жыхароў Падгорнай.**


Мост з аднаго боку выглядае прыстойна.


Аляксандр, які жыве насупраць, лічыць, што адным пяском Дзебру не ўтаймуеш.


Небяспечны мост — любімае месца для гульняў дзяцей.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# ХТО Ў ДОМІКУ ЖЫВЕ?

## У судзе разглядаецца пытанне высялення з жылля шматдзетнай сям'і. На чыім баку праўда?

**З вёскі Вуглы Брагінскага раёна на нашу рэдакцыйную «гарачую лінію» звярнулася шматдзетная маці (у яе трое дзетак, паводле слоў заяўніцы, чакае чацвёртага, зараз у водпуску па доглядзе дзіцяці) Юлія Якабаўна Кузакова. Яна расказала пра сваё жыццё-быццё за апошнія гады. У прыватнасці, як працавала ў раённым камбінаце бытавога абслугоўвання ў Брагіне, але з-за адсутнасці жылля мусіла вярнуцца ў сваю вёску. Тут папрасілася пажыць у так званым «прэзідэнцкім доміку» — аднапавярховым жыллі з усімі выгодамі, якое знаходзіцца на балансе сельскага выканкама.**

— І вось ужо два гады мяне спрабуюць выселіць без прадастаўлення іншага жылля. Былі судовыя пасяджэнні, наперадзе зноў суд. Мне кажуць, што дом, у якім я цяпер жыву, прызначаны для маладых спецыялістаў. Раней гэта называлася службовым жыллём, зараз яно пераведзена ў арэнднае. Дык чаму ў такім выпадку я не магу прэтэндаваць на яго? Стаю ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў ужо дзесяць гадоў, — гаварыла нам Юлія Якабаўна.

Падчас размовы высветлілася, што ў вёсцы ёсць дом, які належаў дзядулю заяўніцы, але, паводле слоў жанчыны, жыллё трухлявае, непрыдатнае для пражывання. Маўляў, гэта засведчылі камісіі, якія выязджалі на месца.

Каб разабрацца ў сітуацыі з высяленнем з жылля шматдзетнай сям'і, мы звярнуліся па каментарыі ў Вуглоўскі сельвыканкам, на балансе якога, як адзначалася вышэй, знаходзіцца «спрэчны» дом. І пачулі некалькі іншую версію падзей... Пачнём хоць бы з таго, што спадарыня Юлія засялілася ў жыллё... самавольна.

— Усяго на нашым балансе знаходзяцца чатыры такія дамы, якія нядаўна былі пераведзены ў камерцыйнае жыллё. Яно прызначана для маладых спецыялістаў раённага адзела адукацыі, яго выдзяленне ўзгадняецца з дэпартаментам па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пры Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, паколькі дамы будаваліся па «чарнобыльскай праграме», — паведаміла **выконваючая абавязкі старшыні Вуглоўскага сельвыканкама Святлана ПРОТЧАНКА.** — У доме, які цяпер займае шматдзетная маці Кузакова, раней жыла настаўніца. І вось у яе Юлія Якабаўна папрасілася пажыць — як на кватэры, пераехаўшы з дзядулевага жылля.

Як расказала далей Святлана Іванаўна, у снежні 2014-га тая настаўніца, якая чакала дзіця, звольнілася, а потым і ўвогуле пераехала на іншае месца жыхарства. У доме фактычна са студзеня 2015 года засталася сям'я Кузаковай. Паколькі была зіма, ды і дом трэба было абаграваць, вырашылі часова пакінуць яе тут. Пасля, па дамоўленасці, Юлія Якабаўна павінна была вярнуцца назад у хату дзеда, дзе, дарэчы, яна і зарэгістраваная. Аднак час ішоў, а жанчына не збіралася гэтага рабіць. У выніку справу мусілі перадаць у суд...

Асобна трэба сказаць пра дзедаву хату. Паводле слоў Святланы Протчанкі, гэта звычайнае вясковае жыллё з выгодамі, як той казаў, у двары. Але дом даволі вялікі — 70 квадратных метраў і, што самае галоўнае, прыдатны для жылля. Гэта якраз і засведчылі камісіі, якія некалькі разоў яго абследавалі. Канешне, у ім патрабуецца рамонт, асабліва пасля таго, як з канца 2014 года тут ніхто не пражываў. Трэба пераклеіць шпалеры, падправіць столь, перакласці печы.

— І тэрытарыяльны цэнтр выдзяляў Юліі Якабаўне, у якой на той момант ужо было трое дзяцей, матэрыяльную дапамогу на рамонт. Гаворка ідзе пра 17 мільёнаў рублёў «старымі» грашамі. Калі я колькі часу таму сустрэла яе, яна запэўніла, што ўжо закупіла цэглу і дамовілася з печнікам адносна перакладкі печаў, — сказала выконваючая абавязкі старшыні сельвыканкама.

Дарэчы, за жыллё, якое Юлія Кузакова захапіла самавольна, яна нічога не плаціць: афіцыйных жа дакументаў ніякіх няма. Як расказала Святлана Іванаўна, падчас аднаго з выездаў камісіі да заяўніцы на яе быў складзены адміністрацыйны пратакол за абразу ў прысутнасці ўчастковага начальніка жыллёва-камунальнай гаспадаркі...

Пра словы Юліі Якабаўны адносна сваёй дзесяцігадовай чаргі як маючай патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў Святлана Протчанка паведаміла наступнае:

— Сапраўды, як маці-адзіночка Кузакова стаіць на такім уліку. З адным дзіцем. Мы прасілі яе абнавіць дакументы, але... Праўда нават у гэтым выпадку яна не можа прэтэндаваць на жыллё (да чатырох «прэзідэнцкіх домікаў» хутка здадуць яшчэ адзін), якое, як гаварыла вышэй, прызначана для маладых спецыялістаў — настаўнікаў. У дом, які цяпер займае сям'я Кузаковай, ужо ўзгоднены ў якасці часовага гаспадара новы чалавек, які прыбывае па размеркаванні, але пакуль пасяліць яго ў жыллі мы не можам.

Пра суд выканаўца абавязкаў старшыні сельвыканкама зазначыла, што ён прызначаны на канец жніўня. Грамадзянскі муж нашай заяўніцы нідзе не працуе, цяпер знаходзіцца на заробках у Расіі. Ён таксама пражывае ў «спрэчным» доме, таму неабходна і яго прысутнасць на судовым пасяджэнні.

...Паколькі ў гэтай гісторыі атрымалася шмат супярэчнасцяў, я патэлефанавала Юліі Кузаковай. Яна абвергла абразу чыноўніка. «Гэта была мая сваячка, яна і атрымала штраф». Далей пацвердзіла, што сапраўды набыла цэглу, але нічога не стала рабіць, паколькі і пакупка будматэрыялаў, і позва ў суд, паводле яе слоў, адбыліся амаль адначасова. «Буду чакаць апошняга суда. У мяне ўжо пыталіся, колькі часу спатрэбіцца на высяленне, калі рашэнне будзе прынятае не на нашу карысць. Я адказала, што месяцпаўтара. Вось за гэты час тады і зробім рамонт у хаце». Але калі давядзецца перакладваць печы, наўрад ці яго можна будзе завяршыць цалкам за гэты тэрмін. Пакуль гліна не прасохне, не прыбярэцца бруд, тыя ж шпалеры не паклеіш. А калі яшчэ верасень будзе халодны, як пратапіць, пакуль печы не зробяць? А ў сям'і — дзеці!.. Чаму жанчына не абнавіла дакументы ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, я, шчыра кажучы, з яе тлумачэнняў так і не зразумеў.

Юлія Якабаўна настойвае, што мела часовую рэгістрацыю ў доме, які цяпер займае. «Няхай выклікаюць у якасці сведкі тую настаўніцу, якая раней жыла тут». Заяўніцы падаецца, што факт рэгістрацыі пацвярджае законнасць валодання ёй жыллём... Пра хату дзеда кажа што яна ёй не вельмі патрэбная, тым больш што на долю ў ёй могуць прэтэндаваць чатыры чалавекі з блізкай радні. Заўважым, што дзед заяўніцы пайшоў з жыцця тры гады таму, а пытанні спадчыны (ці адмовы ад яе), наколькі мы зразумелі, дагэтуль не вырашаны...

Паверце, ніхто нікога не судзіць і не асуджае, не імкнецца знайсці нешта «смажанае». Мы проста паспрабавалі разабрацца ў сітуацыі, выслухаўшы бакі. У Юліі Кузаковай, як той казаў, свая праўда, часам, як падалося, змешаная і замешаная цалкам на эмоцыях. Падчас нашай першай размовы заяўніца не адзін раз вось так эмацыянальна пыталася: «Усюды кажуць пра шчаслівае мацярынства. Дык дзе яно?!» Але хіба выдзяленне жылля ёсць адзіны сімвал шчаслівага мацярынства, хіба дзяцей нараджаюць, толькі каб атрымаць дом? Без жылля ніяк, ніхто ж гэтага не аспрэчвае, і шматдзетную маці цалкам можна зразумець. Але ёсць яшчэ і заканадаўства. Як і абавязак дарослага чалавека зрабіць нейкія самастойныя крокі па вырашэнні пытанняў, скіраваных на паляпшэнне дабрабыту сям'і, дзяцей...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | **Червенское РАЙПО,** г. Червень, ул. Ленинская, 32 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Магазин №1 «Колосок»** | Здание специализированное розничной торговли | 43,7 кв.м | 615/С-30833 |

**Адрес:** Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Н. Зеневича, д. 55

**Сведения о земельном участке**: площадь (га): 0,0157, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования. Целевое назначение: Земельный участок для обслуживания здания магазина №1 «Колосок». Ограничения прав в использовании земель: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0,0110 га

**Начальная цена с НДС 20% – 16 429 руб. 38 коп.** (164 293 800 бел. руб.)

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 14.05.2016

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **14.09.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.09.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |